в условиях модернизации образования : материалы Междунар. науч.-практ. конф. с междунар. участ., г. Челябинск, 23 дек. 2015 г. / Челябинский гос. пед. ун-т ; под ред. В. В. Садырина, Е. В. Гнатышиной [и др.]. – Челябинск, 2015. – С. 190–199.

5. Савченков, А. В. Актуальные проблемы взаимодействия вузов с предприятиями // СтройМного. 2016. №4 (5). URL: https://cyberleninka.ru/article/n/aktualnye-problemy-vzaimodeystviya-vuzov-s-predpriyatiyami (дата обращения: 15.01.2025).

***УДК 378.147:004.8:821.161.3-31*Ядвігін Ш.***

***Т. А. Фіцнер***

*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

## ВЫВУЧЭННЕ БІЯГРАФІІ І ТВОРЧАСЦІ ЯДВІГІНА Ш. У ВНУ З ВЫКАРЫСТАННЕМ ІКТ І СІСТЭМЫ ШІ

У сучаснай адукацыі ІКТ на ўроках літаратуры з'яўляюцца неад'емнай часткай вучэбнага працэсу, сродкам актывізацыі пазнаваўчай дзейнасці навучэнцаў, спрыяюць удасканаленню практычных уменняў і навыкаў, дазваляюць больш эфектыўна арганізоўваць работу, павялічваць яе тэмп. Без іх зараз не абысціся. Адносная навінка інфармацыйных тэхналогій – штучны інтэлект (ШІ), выкарыстанне якога актыўна ўваходзіць ва ўсе сферы нашага жыцця. Адукацыя – не выключэнне. Таму важна ўжо зараз вучыцца выкарыстоўваць ШІ ў працы настаўніка/выкладчыка пры вывучэнні творчасці пісьменнікаў і аналізе асобна ўзятых мастацкіх тэкстаў на лекцыйных і практычных занятках у ВНУ. Забараніць выкарыстанне ШІ наўрад ці дзейсна, ды і немагчыма. Калі ў будучыні выпускнікам ВНУ не пазбегнуць выкарыстання ШІ, які імкліва ўваходзіць ва ўсе сферы жыцця, то лепей навучыцца граматна яго выкарыстоўваць, будучы яшчэ студэнтам. І гэтыя навыкі потым выкарыстоўваць у сярэдняй школе на ўроках літаратуры. Думаецца, сучасныя школьнікі цалкам да гэтага падрыхтаваныя.

Нагадаем, што ІКТ – гэта тэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца для апрацоўкі, захоўвання і перадачы інфармацыі. Яны ўключаюць у сябе камп'ютары, праграмнае забеспячэнне, сеткі, інтэрнэт, мабільныя прылады і іншыя сродкі, якія дазваляюць людзям абменьвацца інфармацыяй і ўзаемадзейнічаць. Сістэмы ШІ – гэта падмноства тэхналогій, якія накіраваны на стварэнне сістэм, здольных выконваць задачы, якія патрабуюць інтэлекту, такія як навучанне, распазнанне вобразаў, прыняцце рашэнняў і разуменне натуральнай мовы. ШІ можа выкарыстоўвацца ў рамках ІКТ, але не абмяжоўваецца імі. Такім чынам, ІКТ – гэта больш шырокі тэрмін, які ўключае ў сябе розныя тэхналогіі, а ШІ – гэта спецыфічная вобласць, якая выкарыстоўвае некаторыя з гэтых тэхналогій для стварэння "разумных" сістэм.

У ВНУ пры вывучэнні біяграфіі і творчасці пэўнага пісьменніка выкарыстанне ІКТ ўжо стала нормай. Найперш, гэта шырокае выкарыстанне падчас лекцый прэзентацый (Power Point), у якія нескладана ўключыць фотадакументы відэа- і аўдыёматэрыялы. Наколькі мэтазгодна на лекцыі (ці падрыхтоўкі да яе) выкарыстоўваць ШІ, пакажа час.

Падаецца, выкарыстанне нейрасетак больш карысна пры выкананні творчых заданняў студэнтамі пры падрыхтоўцы да практычных заняткаў. Пры гэтым выкладчык павінен адказна паставіцца да выбару аўтараў і твораў, прадумаць заданні. Разгледзім выкарыстанне ІКТ і сістэмы ШІ на прыкладзе вывучэння біяграфіі і творчасці Ядвігіна Ш.

Калі ўлічваць пераемнасць у сістэме школа – універсітэт – прадпрыемства (для студэнтаў-філолагаў гэта ў большасці выпадкаў школа), то не лішнім будзе звярнуцца да школьнай праграмы. У сярэдняй агульнаадукацыйнай школе творчасць Ядвігіна Ш. вывучаецца ў 9 класе. Для абавязковага вывучэння праграмай па беларускай літаратуры прадугледжана апавяданне "Дуб-дзядуля", на знаёмства з якім адводзіцца 1 гадзіна.

Настаўнік за гэты час, згодна з праграмай, акрамя аналізу твора, павінен таксама даць вучням кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка, а таксама давесці адметнасць яго творчай манеры і мастацкія вартасці прозы. Для самастойнага вывучэння ў 9 класе праграмай прапанавана апавяданне “Бярозка”.

Знаёмства з пісьменнікам у ВНУ (вывучаецца студэнтамі 2 курса філалагічнага факультэта спецыяльнасці 6-05 0113-02 Філалагічная адукацыя. Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская) у межах дысцыпліны “Гісторыя беларускай літаратуры мяжы XIX–XX стагоддзяў”) прадугледжвае больш грунтоўнае веданне яго біяграфіі, таго часавага адрэзку і асяродку, у якім ён фарміраваўся як асоба; студэнтам патрэбна давесці і адметнасць таленту Ядвігіна Ш., і яго ўнёсак у айчыннае мастацтва слова. Знаёмства з усёй творчасцю пісьменніка, яе жанравай разнастайнасцю якраз і будзе спрыяць фарміраванню грунтоўных ведаў аб пісьменніку. Разам з тым колькасць гадзін на вывучэнне біяграфіі і творчасці Ядвігіна Ш. і ў ВНУ даволі абмежаваная – усяго 4 гадзіны (2 з якіх лекцыйныя і 2 – практычныя). За гэтыя гадзіны выкладчыку, па-першае, неабходна актуалізаваць веды студэнтаў па біяграфіі і творчасці пісьменніка, атрыманыя ў 9 класе агульнаадукацыйнай школы, а па-другое, сістэматызаваць іх і максімальна пашырыць.

Рыхтуючы лекцыю-прэзентацыю па біяграфіі і творчасці Ядвігіна Ш., выкладчык можа пакарыстацца гатовай прэзентацыяй, узятай з сеткі Інтэрнэт (ёсць слайды з тэкставай інфармацыяй: https://ppt-online.org/827392, а таксама слайды з тэкстам і фотаздымкамі: https://ppt-online.org/38554). Такі варыянт найменш затратны па часе, але не прымальны для крэатыўнага настаўніка. Бо гатовыя прэзентацыі не ўтрымліваюць увесь неабходны матэрыял, таму іх усё роўна прыйдзецца дапрацоўваць. Падрыхтоўка ўласнай прэзентацыі патрабуе пэўных часавых укладанняў, разам з тым выкладчык сам маніторыць і адбірае інфармацыю, што ўтрымлівае інтэрнэт, таму добра ў ёй арыентуецца і мае магчымасць прапанаваць студэнтам лепшае з таго, што ўтрымлівае сеціва. А гэта:

– нешматлікія фотаздымкі, якія даюць уяўленне пра пісьменніка і яго сям’ю (фота пісьменніка ў маладым і сталым узросце, шлюбнае фота, фота дачкі Ванды з мужам і дзецьмі, фота мемарыяльнага каменя ў Радашковічах з шыльдай, фота вокладак выданняў зборнікаў апавяданняў “Бярозка”, “Васількі”, паэмы “Дзед Завала”, выбраных твораў пісьменніка). Усё гэта дапаможа стварыць / адчуць атмасферу часу, у які жыў пісьменнік;

– спасылку на тэксты твораў Ядвігіна Ш. з Беларускай палічкі (https://knihi.com/Jadvihin_S/ ). На жаль, сайт не змяшчае публіцыстыкі аўтара і яго “Успамінаў”, аднак ёсць аўдыёверсія апавядання “Дуб-дзядуля” і рамана “Золата”;

– відэахостынг/сайт Youtube змяшчае відэа, праз якое можна пазнаёміцца з жыццём і творчасцю Ядвігіна Ш, наведаць (віртуальна) мясціны, дзе ён жыў, паслухаць літаратуразнаўцаў (Ул. Навумовіча, В. Максімовіча, С. Шчэрба), якія падаюць цікавыя звесткі з жыцця пісьменніка, даюць ацэнку яго творчасці, разважаюць пра ўклад Ядвігіна Ш. у развіццё беларускай літаратуры, даводзяць адметнасць яго таленту (Ядвігін Ш.: сігнал да дзеяння!| ЗАПІСКІ НА ПАЛЯХ. – тэлеканал Беларусь 3 ад 06.12.2019 г.: https://www.youtube.com/watch?v=VOQMu1NPNxk).

Што тычыцца практычных заняткаў, то для павышэння эфектыўнасці навучання, рэалізацыі індывідуальнага падыходу і раскрыцця творчага патэнцыялу навучэнцаў можна прапанаваць ім заданні, выкананне якіх прадугледжвае карыстанне нейрасеткамі. Удзячным матэрыялам для гэтага з’яўляецца раман Ядвігіна Ш. “Золата” [1], які айчыннае літаратуразнаўства лічыць першым у гісторыі беларускай літаратуры творам, напісаным у такім жанры. Адметны ён яшчэ і тым, што аўтар не закончыў яго. Таму мэтазгоднымі, на наш погляд, будуць наступныя заданні па яго засваенні з дапамогай штучнага інтэлекту:

1. *Прачытаць твор, знайсці апісанне галоўных герояў і прапанаваць ШІ стварыць іх выявы/партрэты, то бок, візуалізаваць іх па гэтых апісаннях-цытатах з рамана*. Маюцца на ўвазе галоўныя вобразы: жабрачка Прузына, Мікола Стрончык, Зося Стрончык, Алёкса Гуронак, Васіль Дубінскі, Прузына Сальнічышка. У тэксце пададзены

як аўтарскія, так і апісанні праз успрыманне іх іншымі героямі твора. Можна ўскладніць заданне: спачатку загрузіць па адной цытаце, а потым усе адразу цытаты-апісанні аднаго героя, што прысутнічаюць у рамане, каб параўнаць, наколькі будуць розніцца яго выявы. І выбраць з прапанаваных ШІ візуалізаваных вобразаў той, які найбольш адпавядае уяўленню самога студэнта. У гэтым можа дапамагчы нейрасетка Midjourney.

2. *Дапісаць раман з дапамогай ШІ.* Прасачыць лёс кожнага з галоўных герояў, які не паспеў прасачыць аўтар. Гэтае заданне можна выканаць з дапамогай нейрасеткі ChatGpt. Аднак улічваючы той факт, што нейрасетка выдае толькі агульныя парады (можа падказаць логіку развіцця характараў, дзеяння, бо не знаёмая са зместам рамана Ядвігіна Ш.), студэнту патрэбна будзе актывізаваць сваю фантазію/вобразнае мысленне і веды, каб дапісаць раман за аўтара.

3. *Адрэдагаваць прапанаваны ШІ варыянт, калі ён не спадабаўся або ШІ зрабіў памылкі (у беларускамоўнай версіі сустракаюцца памылкі).* Штучны інтэлект у цэлым няблага працуе з беларускай мовай, тым не менш дапускае шэраг арфаграфічных і граматычных памылак, сустракаюцца і памылкі на лексічным узроўні. Таму студэнтам ёсць магчымасць праверыць сваю пісьменнасць і зрабіць карэктуру тэкста, прадстаўленага нейрасеткай.

Прадставіць сваю працу студэнты могуць у выглядзе прэзентацыі (адной або некалькіх) з выкарыстаннем Power Point або Prezi, дзе будуць прадстаўлены цытаты-апісанні герояў і візуалізацыя іх па гэтых цытатах, прапанаваная ШІ. А таксама графічна або тэкстава прасочаны лёс галоўных герояў. Студэнты таксама мусяць патлумачыць, ці ўсё іх задаволіла ў прапанаваных нейрасеткай вобразах, як яны самі ўяўляюць герояў і як бы іх намалявалі. Ці задаволіў іх прапанаваны штучным інтэлектам працяг твора? І станоўчы і адмоўны варыянт адказу неабходна будзе аргументаваць.

Падсумоўваючы, зазначым, што першасным у навучанні і ў школе, і ва ўніверсітэце павінен заставацца настаўнік, яго асоба, жывая гутарка з навучэнцамі. Аднак цалкам ігнараваць развіццё тэхналогій у сучасным свеце немагчыма, таму варта спалучаць гэтыя падыходы, стымулюючы тым самым матывацыю навучэнцаў, уплываючы на іх адносіны да вучобы. Выкарыстанне ІКТ і сістэмы ШІ на занятках па вывучэнні біяграфіі і творчасці пісьменнікаў адпавядае часу і з'яўляецца мэтазгодным пры падрыхтоўцы настаўнікаў-філолагаў, якія панясуць засвоеныя веды і навыкі вучням у школы.

**Літаратура**

1. Ядвігін Ш. Золата / Ядвігін Ш. // Выбраныя творы – Мінск : Маст. літ., 2006. – С. 83–142.

***УДК 376.545***
***Т. Г. Флерко, А. П. Гусев***
*г. Гомель, ГГУ имени Ф. Скорины*

## ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ УНИВЕРСИТЕТА И УЧРЕЖДЕНИЙ ОБЩЕГО СРЕДНЕГО ОБРАЗОВАНИЯ В РАБОТЕ С ОДАРЕННЫМИ УЧАЩИМИСЯ В ОБЛАСТИ НАУК О ЗЕМЛЕ

Работа с одаренными учащимися и их педагогами ведется преподавателями геолого-географического факультета по нескольким направлениям:

– занятия в ресурсном центре, организованном Гомельским областным институтом развития образования, в период с сентября по декабрь каждого учебного года;

– круглогодичные онлайн-занятия по подготовке учащихся к олимпиадам (для районных учреждений образования Гомельской области);